УДК 37(476)(091)“15”

# АФАРМЛЕННЕ ЗЫХОДНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЕЗУІЦКАГА ОРДЭНУ Ў 1550-я ГАДЫ

***Андрэй Самусік***
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*
a.f.samusik@gmail.com

У навуковым артыкуле ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі разгледжаны першапачатковыя захады езуітаў па выпрацоўцы агульных падыходаў да арганізацыі адукацыйнай справы. Адзначана адпаведная дзейнасць рэктара калегіўмаў у Месіне і Рыме І. Надаля. Падрабязна вывучаны “Канстытуцыі езуіцкага ордэну” 1558 г., IV частка якіх была цалкам прысвечана пытанням функцыянавання навучальных устаноў ордэна.
***Ключавыя словы: адукацыя, “хрысціянскі гуманізм”, езуіты, І. Лайёла, І. Надаль, “Канстытуцыі езуіцкага ордэну” 1558 г.***

# THE FORMATION OF THE BASIC PRINCIPLES OF THE EDUCATIONAL ACTIVITY OF THE JESUIT ORDER IN THE 1550s

***Andrej Samusik***
*Belarus State Economic University, Minsk, Belarus*

In the scientific article, for the first time in national historiography, the initial steps of the Jesuits to develop general approaches to the organization of educational affairs were considered. The relevant activity of the rector of collegiums in Messina and Rome, I. Nadal, was noted. The "Constitution of the Jesuit Order" of 1558 was studied in detail, the IV part of which was fully devoted to the functioning of the order's educational institutions.
***Keywords: education, "Christian humanism", Jesuits, I. Loyola, I. Nadal, "Constitutions of the Jesuit Order" 1558.***

У XVI ст. на абшарах Еўропы пачалі складвацца асобныя адукацыйныя сістэмы. Да жыцця іх выклікалі, як гуманістычныя ідэі эпохі Адраджэння, так і пратэстанцкі рух, а таксама Контррэфармацыя. Ва ўмовах вострага міжканфесійнага супрацьстаяння навучальныя ўстановы сталі адыгрываць куды большае значэнне. У іх сценах канцэнтраваліся найбольш дасведчаныя прыхільнікі той ці іншай рэлігіі, рыхтаваліся навуковыя ды палемічныя творы, адбывалася “змаганне” за падрастаючае пакаленне. Адукацыя ж апошняга ўспрымалася ў непарыўнай сувязі з належным выхаваннем. У выніку, аформіўся так званы “хрысціянскі гуманізм”, згодна якому засваенне старажытных моў, красамоўства, філасофіі ды тэалогіі сумяшчалася з маральнымі нормамі, закладзенымі ў Св. Пісанні.

Найбольш дасканалую на той час педагагічную сістэму здолелі стварыць езуіты – каталіцкі манаскі ордэн, які быў заснаваны ў 1534 г. на хвалі Контррэфармацыі з мэтай умацаваць пахіснуўшыяся пазіцыі каталіцкай царквы. Зрабіць гэта яны планавалі праз адпаведнае выхаванне моладзі. Заснавальнік ордэну іспанец І. Лайёла пісаў, што будучыня належыць тым, хто трымае ў руках маладое пакаленне [1, с. 131]. Першы іх

калегіўм пачаў сваю дзейнасць у Месіне на Сіцыліі ў 1548 г. і за наступныя 8 год да яго дадаліся яшчэ 32 аналагічныя навучальныя ўстановы [2, с. 46].

Менавіта рэктар Месінскага калегіўма І. Надаль у 1552 г. па загаду І. Лайёлы склаў першы школьны статут ордэна – "Выхаванцам Таварыства Ісуса" ("De studiis Societatis Iesu"). У далейшым ён стаў рэктарам Рымскага калегіўма і на гэтай пасадзе ўдасканаліў уласны статут, выдаўшы ў 1565 г. яго дапрацаваны варыянт – "Парадак навучання" ("Ordo studiorum"). Зыходным тут з'яўляўся акцэнт на вывучэнні гуманітарных прадметаў, з выніковай мэтай – засваенне тэалогіі. Вучэбна-выхаваўчы працэс адбываўся згодна дакладна вызначанай праграме, у якой кожны настаўнік замацоўваўся за канкрэтным класам. Змест заняткаў рэгулявалі адзіныя для ўсіх інструкцыі. Ён адпавядаў неасхаластычным методыкам выкладання ды адбываўся ў адпаведнасці з прынцыпам "Вучыць для жыцця" ("Docere pro vivere") [3, с. 262-268]. Менавіта гэты статут І. Надаля ордэнскія ўлады рассылалі па ўласных адукацыйных асяродках у іншых краінах – вядома, напрыклад, што адкрыты ў 1564-1565 гг. першы польскі калегіўм у Брунсбергу кіраваўся якраз ім [4, с. 30-31].

Акрамя згаданага нарматыўнага дакумента паўсюдна рассылаліся яшчэ і "Канстытуцыі езуіцкага ордэну" ("Constitutiones Societatis Iesu"), зацверджаныя І Генеральнай кангрэгацыяй у 1558 г. Менавіта у іх IV частцы ўпершыню афіцыйна былі вызначаны асноўныя прынцыпы арганізацыі езуітамі ўласнай адукацыйнай сістэмы.

Так, ва ўводзінах імі адзначалася, што для: "лепшага пазнання Бога і служэння яму" будуць засноўвацца калегіўмы ды ўніверсітэты. Здзейсніць гэты намер можна было толькі праз фінансавую падтрымку мясцовай правячай эліты, а таму ўжо ў першым раздзеле гэтай частцы "Канстытуцый" падрабязна распісваўся працэс ушанавання фундатараў асобных навучальных устаноў. Гэта залежнасць ордэна ад прыватных ахвяраванняў стала і абгрунтаваннем яго дабрачыннай дзейнасці – езуіты-настаўнікаў абавязалі адмаўляцца ад узнагароджання за сваю працу і: "бясплатна даваць тое, што бясплатна атрымалі…" [5, с. 26-27, 36].

Далей адзначалася, што агульнае кіраўніцтва імі ажыццяўляе генерал, але найбольш важныя пытанні, якія датычацца складаных для выканання ўмоў асобных ахвяраванняў, альбо закрыцця школ абмяркоўвае Кангрэгацыя ордэну. Таксама тут падкрэслівалася важная роля, прызначаемага генералам "належным чынам кваліфікаванага" рэктара, якому даваліся шырокія паўнамоцтвы: "Ва ўсіх сваіх рашэннях рэктар няхай пастулае тым шляхам, які ён лічыць найбольш спрыяльным для Таварыства і славе Божай". Яго намеснікам з'яўляўся прарэктар, а за вучэбную частку адказваў, прызначаны ім сіндык. Апошні наглядаў за настаўнікамі і нават мог адхіліць іх ад выканання сваіх абавязкаў. Ва ўніверсітэтах таксама меліся пасады дэканаў, якія разам з двумя абранымі прафесарамі прадстаўлялі інтарэсы свайго факультэта перад рэктарам ды вырашалі яго надзённыя праблемы. Самі ж прафесары ды настаўнікі ("працэптары") павінны вызначацца эрудыцыяй, "добрай мараллю" ды здароўем. Іх абавязак – старанна рыхтавацца да лекцый, рабіць нататкі: "каб прадугледзець любыя будучыя дэфекты памяці", а таксама складаць справаздачы аб уласнай працы [5, с. 28-29, 33, 35, 39-43, 45, 47-48].

Навучанне рэкамендавалася арганізаваць так, каб знайсці гарманічны баланс паміж заняткамі ды адпачынкам (у тым ліку сном), а таксама, каб удзел выхаванцаў у рознага віду рэлігійных практыках умацоўваў іх у хрысціянскіх дабрачыннасцях, але адначасова не замінаў у вучобе. Пералік прадметаў у "Канстытуцыях" даваўся ў агульных абрысах: "розныя мовы, логіка, натуральная і маральная філасофія, метафізіка, тэалогія, а таксама схаластыка". Асобна тут падкрэслівалася, што: "У вучобе трэба сачыць за парадкам, каб трывалая аснова ў лацінскай мове была закладзена раней, чым у вызваленых мастацтвах, а ў іх перад тым, як прыступіць да схаластычнай тэалогіі, а ад яе перайсці да пазітыўнай тэалогіі. Святое Пісанне можна браць у рукі адначасова з імі альбо пасля іх засваення". Прычым, працяг вывучэння асобных курсаў кожным з вучняў, іх змест (павінен адпавядаць "найбольш бяспечнай і зацверджанай дактрыне") ды вызначэнне адпаведных аўтараў для вывучэння – з'яўлялася прэрагатывай рэктара. Выхаванцаў жа неабходна было пераконваць у тым, што нават калі ў далейшым жыцці ім і не спатрэбяцца атрыманыя веды, яны ўсё роўна павінны іх засвойваць, бо ў маладосці гэта іх галоўны абавязак перад Богам, тым больш, што вучоба ўмацоўвае іх у веры ды хрысціянскай маралі. Дзеля гэтага раз на тыдзень выхаванцам чытаўся катэхізіс, які яны павінны былі за час навучання вывучыць на памяць. Штотыднёвыя дэкламацыі таксама акрамя выпрацоўцы стылю мелі выхаваўча-маралізатарскую скіраванасць, а таму прысутнасць на іх вучняў была абавязковай. На занятках настаўнік абавязваўся пры кожнай зручнай магчымасці: "заахвоціць сваіх вучняў да служэння і любові Богу і да ўсіх дабрачыннасцяў, якімі яны могуць дагадзіць Яму…" [5, с. 28, 30-33, 36, 41, 44, 46-47].

Апошні аспект знайшоў сваё адлюстраване і ва ўспрыманні езуітамі ўзаемазалежнасці выкладаемых імі прадметаў. У "Канстытуцыях" адзначалася: "Паколькі мэтай Таварыства… з'яўляецца дапамога бліжнім у пазнанні міласэрнасці Бога і выратвання іх душ, і паколькі для гэтай мэты найбольш правільным сродкам з'яўляецца вывучэнне Тэалогіі… неабходна працаваць над гэтым і старанна выкладаць дастатковай колькасцю Настаўнікаў усё, што датычыцца Схаластычнай дактрыны і Святога Пісання… Паколькі вывучэнне Тэалогіі… патрабуе, асабліва ў наш час, ведання гуманітарных навук, а таксама Лацінскай, Грэчаскай і Яўрэйскай моў, кампетэнтных Прафесараў для якіх трэба прызначаць у дастатковай колькасці… Паколькі Мастацтва (*логіка, метафізіка, маральная філасофія* – А.С.), інакш кажучы Навукі натуральныя рыхтуюць розум да тэалогіі і спрыяюць яе дасканаламу вывучэнню… няхай іх засвойваюць эрудыраваныя Настаўнікі з належнай стараннасцю, шчыра шукаючы гонару і славы Божай ва ўсім. Медыцына і права, як увогуле не адпавядаючыя нашаму інстытуту, не будуць выкладацца… ці прынамсі сам ордэн не будзе браць на сябе такое ярмо" [5, с. 42-43].

Дыспуты, пры гэтым, абвяшчаліся карыснай справай (найперш для тых, хто засвойваў вызваленыя мастацтва ды тэалогію). Яны павінны былі штодзень арганізоўвацца ў асобных класах – адзначалася, што такім чынам выхаванцам прасцей праявіць свае таленты, акрэсліць ды пераадолець цяжкасці, якія ўзнікаюць у час вучобы. Раілася практыкаваць дыспуты з удзелам выхаванцаў рознага ўзроўню падрыхтоўцы – для адных гэта было б паўторам вывучанага, а для іншых – узорам для пераймання. Настаўнік жа сачыў за ходам дэбатаў, а напрыканцы іх падводзіў выснову. Маглі дыспуты арганізоўвацца і публічна раз на тыдзень – рэкамендавалася праводзіць іх па нядзелях пасля абеда. Тэма дэбатаў вывешвалася “на дзвярах школы напярэдадні вечарам”, выказвацца мелі права ўсе прысутныя, але старшыню дыспута прызначаў рэктар. Перад усімі жадаючымі раз на тыдзень дазвалялася выступаць тым з вучняў, хто праяўляў празаічныя ды паэтычныя здольнасці, а таксама меўшым аратарскі талент – яны выступалі з прамовамі на грэчаскай ці лацінскай мовах. Апошняя, дарэчы, абвяшчалася абавязковай для ўжытку выхаванцамі старэйшых класаў [5, с. 33-34, 43].

Згодна “Канстытуцыям” рэкамендавалася паўсюдна ствараць школьныя бібліятэкі з вызначэннаем рэктарам адказнага за іх. Таксама дазвалялася мець уласныя кнігі і членам ордэну, якія ім былі неабходны для выканання сваіх настаўніцкіх абавязкаў. У цэлым, адзначалася, што трэба чытаць тыя кнігі, якія ў кожным класе: “цэняцца ў якасці найбольш аўтарытэтных і не пярэчачых дактрыне”. Адносна тэалогіі, напрыклад, раілася чытаць Св. Пісанне, вывучаць схаластычную дактрыну Фамы Аквінскага, а таксама ведаць тых аўтараў, якія найлепшым чынам адпавядаюць пэўнай тэматыцы ды вызначаны ордэнскімі ўладамі. Абмяжоўвалася ўжыванне антычнай мастацкай літаратуры, з пераліку якой выключаліся кнігі, якія супярэчылі хрысціянскай маралі. Іх вывучэнне дазвалялася толькі пасля: “ачышчэння ад непрыстойных рэчаў альбо слоў”. Асноўным жа аўтарам абвяшчаўся Арыстоцель ды прызнаныя царквою яго каментатары. Яго творы рэкамендавалася ўжываць на занятках па красамоўству ды філасофіі. У дадатак настаўнікам дазвалялася выкарыстоўваць іншыя літаратурныя крыніцы, але ў духу агульнай дактрыны, якую яны выкладаюць [5, с. 33, 44-45].

Надзвычай важным пастулатам “Канстытуцый” было прызнанне іх складальнікамі наяўнасці рэгіянальных асаблівасцяў. З гэтай нагоды яны пісалі аб тым, што ў выкладанні асобных прадметаў можа прысутнічаць разнастайнасць з прычыны рознага месцазнаходжання школ і шануемых у іх рэгіёне аўтараў. Як след гэтага адзначалася: “Мы не будзем тут настойваць на аднастайнасці, але заяўляем, што у кожным калегіўме павінны быць устаноўлены дакладныя правілы”. У сваю чаргу, настаўнікам раілася на занятках улічваць спецыфіку ўспрымання мясцовым насельніцтвам працэса засваення ведаў, які можа адрозніваца ад “схаластычнага метаду”, а каб найлепшым чынам данесці да іх свае погляды ды хрысціянскія дактрыны: “старанна авалодаць народнай мовай гэтай краіны”. Разам з тым, акцэнтавалася магчымасць перамяшчэння выхаванцаў з адной навучальнай установы ў іншую, што лічылася стымулам для поспехаў у вучобе ды ўмовай умацавання ў дабрачыннасцях. Прычым, на новым месцы раілася пачынаць з паўтору ўжо пройдзенага матэрыялу. Але для якаснай рэалізацыі падобных пераездаў абавязковай умовай быў: “метад аднолькавы”, што павінно было, разам з рэгулярнай ратацыяй настаўніцкіх кадраў, садзейнічаць дасягненню ўніверсальнасці вучэбных праграм калегіўмаў, размешчаных у розных дзяржавах [5, с. 36-38, 43].

Асобна аўтары “Канстытуцый” спыніліся на тэрміне навучання. Яны адзначалі, што ў дачыненні вывучэння моў ды “гуманітарных навук” ён не можа быць дакладна вызначаны: “з-за розніцы ва ўзроўні, таленце і інфармаванасці выхаванцаў”. На засваенне курса філасофіі імі давалася тры гады (адпаведна на логіку, метафізіку ды маральную філасофію) і яшчэ шэсць месяцаў адводзілася на падрыхтоўку да здачы экзамена на ступень магістра. Тэалогію, у сваю чаргу, вывучалі ў два этапы – за чатыры гады: “Трэба прачытаць усё неабходнае”, а яшчэ два гады рыхтавалася доктарская дысертацыя. Рашэнне аб наданні вучоных ступеней прымала спецыяльная камісія з дасведчаных у дадзенай галіне ведаў асоб. Прычым, зноў падкрэслівaўся бясплатны характар усяго працэсу навучання ажно да атрымання рангу доктара тэалогіі [5, с. 45-46].

Для больш эфектыўнага падтрымання дысцыпліны ў навучальных установах “Канстытуцыі” уводзілі пасаду карэктара, які не быў членам ордэна і караў тых, хто не жадаў старанна вучыцца, парушаў нормы маралі і для каго: “Адных добрых слоў ды павучанняў недастаткова”. Калі ж і гэтага было недастаткова рэктару давалася права выгнаць нядбайнага ды зусім безнадзейнага выхаванца са школы: “дзе ён не робіць дабро сабе, а іншым прыносіць толькі шкоду” [5, с. 47].

Наяўнасць у езуіцкіх навучальных установах статута І. Надаля ды “Канстытуцый езуіцкага ордэну” прыдала ім аднастайны выгляд. Аналіз каталагаў Аўстрыйскай правінцыі за кастрычнік 1571 г. сведчыць, што ў калегіўмах Брунсберга ды Вільні падзел на класы быў аднолькавы: “Даната” (Э. Данат – рымскі навуковец IV ст., аўтар славутых лацінскіх граматык), граматыцы, сінтаксіса, гуманіёры (паэтыцы) і рыторыцы. Адзінае ж адрозненне заключалася ў змесце дадатковых заняткаў, што вялі ў старэйшых класах “лектары”: у Брунсбергу асобны езуіт выкладаў у класе гуманіёры “больш складаныя ўрокі” (“difficiliorum lectionum”), а таксама дыялектыку ў класе рыторыцы, а ў Вільні – у абодвух гэтых класах праходзілі грэчаскую мову [6, с. 316-317, 320-322].

Такім чынам, не выклікае сумненняў, што менавіта ў 1550-я гг. былі закладзены зыходныя прынцыпы арганізацыі адукацыйнай справы ў езуіцкім ордэне. Найбольшае значэнне тут мелі, зразумела “Канстытуцыі езуіцкага ордэну”, якія ажно да выхаду ў 1599 г. славутага “Зместа і асноўных прынцыпаў навучання” (“Ratio, atque institutio studiorum”) метадычна рэгулявалі працэс функцыянавання навучальных устаноў езуітаў ва ўсім свеце.

1. Самусік, А.Ф. Усталяванне езуіцкага ордэну ў Польшчы і ВКЛ (да пачатку 1570-х гг.) / А.Ф. Самусік // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. научн. статей / под ред. Р.Б. Гагуа [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2022. – Вып. 7. – С. 130-133.
2. Шевченко, Т. Єзуїтське шкільництво на українських землях останньої чверти XVI – середини XVII ст. / Т. Шевченко. – Львів : Свічадо, 2005. – 340 с.
3. Codina, M.G. Aux sources de la pedagogie des jesuites : Le “Modus parisiensis” / M.G. Codina. – Roma : Institutum Historicum S.I., 1968. – XVI, 370 p.
4. Piechnik, L. Gimnazjum w Braniewie w XVI w. Studium o początkach szkolnictwa jezuickiego w Polsce / L. Piechnik // Nasza Przeszłość. – 1958. – T. VII. – S. 5–71.
5. The Constitutions of the Society Jesus : printed by the at Rome 1558. Rendered into English from the Latin : with an appendix, containing the three bulls for the institution, suppression, and restoration of the order of jesuits : and an outline of the present condition of the romish church in this Kingdom. – London : J.G. and F. Rivington, 1838. – 140 p.
6. Catalogi personarum et officiorum provinciae Austriae S.I. : in 2 t. / coll. et edid. L. Lukács. – Romae : Institutum Historicum Societatis Iesu, 1978-1982. – T. 1 : 1551-1600. – 1978. – XXI, 828 p.